Акцыя “Пячэнька за пячэньку”

Аўтар: паводле grodnensis.by
20.11.2016 00:00



Традыцыйн акцыю “Пячэнька за пячэньку” арганізуе душпастырства моладзі “OPEN” Да брачыннае мерапрыемства на карысць дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці пройдзе ў гродзенскім катэдральным касцёле 27 лістапада, у першую нядзелю Адвэнту.

Пасля кожнай св. Імшы маладыя людзі будуць раздаваць за ахвяраванні ўласна зробленае печыва. Любы жадаючы можа прыняць удзел у акцыі: спячы пячэнне і перадаць яго валанцёрам або скласці ахвяру, атрымаўшы за гэта пачастунак.

Дадзеная акцыя праводзіцца душпастырствам “OPEN” на працягу некалькіх гадоў.

Атрыманыя сродкі накіроўваюцца ў Гродзенскі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.